характерными чертами «золотой середины», «бесстрастности», поэтому мелодия, как правило, имеет ровный, плавный рисунок. В силу необходимости соответствия закономерностям развития природы композиция форм является однообразной. Противопоставление форм находит свое конкретное проявление в том, что «на базе рефренов создаются частичные, местные вариации раскрытия темы с импровизационным характером, путем изменений ритма и темпа реализуется компоновка музыкальной композиции» [2, с. 61].

Что касается тембра, китайские инструменты подчеркивают индивидуальность, они преимущественно изготавливаются из природных материалов. Каждый инструмент обладает своим характерным индивидуальным тембром, что в особенности хорошо передает самые минимальные изменения динамики, колорита, высоты звука. Национальные китайские музыкальные инструменты преимущественно относятся к мелодическим. Традиционные китайские национальные музыкальные инструменты, такие как гуцинь, флейта сяо, бамбуковая дудочка, эрху и др., отличаются уникальным характерным тембром, который весьма подходит для выражения линейного рисунка мелодии. Как в игре ансамбля, так и при упоре на мелодию, в инструментальной музыке практически отсутствуют аккорды, басы и контрапункт.

Таким образом, мы приходим к выводу, что китайская нородная музыка демонстрирует такую черту, как одноголосие: одноголосная мелодия китайской народной музыки несет в себе всю полноту музыкального содержания, ей нет необходимости использовать сложные гармонии, полифонические приемы, ее ритм, лад и форма композиции обычно свободный неопределенный и неупорядоченный.

**Список литературы:**

1. 李吉提 再谈线性音乐的线性分析技术西安音乐学院学报 1996年第4期 = Ли, Цзити. И снова о технике линейного анализа линейной музыки / Цзити Ли // Вестник сианьской консерватории. – 1996. – № 4. – С. 45–47.
2. 李姝 中西音乐美学比较研究博士艺术学成都四川大学 = Ли, Шу. Сравнительные исследования китайской и западной музыкальной эстетики : дис. ... канд. искусствоведения / Шу Ли. – Чэнду : Сычуаньский университет, 2007. – 179 с.
3. 王次炤 中国传统音乐文化中的人文精神音乐研究 1991年第4期 = Ван, Цычжао. Дух гуманности в традиционной китайской музыкальной культуре / Цычжао Ван // Музыкальные исследования. – 1991. – № 4. – С. 66–68.
4. 徐大椿 乐府传声译注北京中国戏剧出版社 = Сюй, Дачунь. Переводы и комментарии к данным Музыкальной палаты / Дачунь Сюй. – Пекин : Китайский театр, 1982. – 170 с.

***Мікіта Хлькоў***

## ЭТНАМУЗЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ: БЕЛАРУСКАЯ ТРАДЫЦЫЯ І ЗАМЕЖНЫ ВОПЫТ

*У артыкуле, прысвечаным этнамузычнаму выхаванню, характар традыцыйнага навучання музыцы ў беларускіх фальклорных і постфальклорных асяродках супастаўляецца з некаторымі аспектамі методык Карла Орфа, Шынічы Сузукі, сучасным вопытам перайманння фальклорных узораў.*

***Mikita Khalkou***

## ETHNO-MUSICAL EDUCATION: BELARUSIAN TRADITION AND EXPERIENCE OF OTHER COUNTRIES

*The paper concerns the Ethnomusical education. Folk music education in Belarusian folklore and postfalklore circles correlated with certain aspects of the method of Carl Orff, Shinichi Suzuki, the modern experience of transmission of folk art.*

Этнамузычнае выхаванне з'яўляецца адным з найцікавейшых сродкаў выхавання асобы. Дзякуючы пэўным гістарычным і культуралагічным зменам, у кожнага народа (этнасу) была створана свая непаўторная сістэма стварэння музычных сродкаў, формаў выканальніцтва ды, канешне ж, працэсу навучання ў дадзенай галіне. Сучасная медыйная культура мае сродкі стварыць «трэнд» з любой культуры, гарантуе ёй новае жыццё і ўвасабленне. Напрыклад, дзякуючы папулярным тэлесерыялам, на хвалю папулярнасці ўзнялася культура вікінгаў, дзякуючы распаўсюджванню масавай анімэ-культуры, не згасае зацікаўленнасць культурай Японіі і інш. Для таго, каб зацікавіць сучаснага чалавека, сучасную моладзь, этнавыхаванне, у папярэднім прыкладзе, падаецца ў прывабнай форме (пачынаючы ад прывабнага знешнега выгляду даследчыкаў ды выкладчыкаў, завяршаючы трэндавай формай данясення навуковай і культурнай інфармацыі).

На сённяшні дзень тэма трансфармавання беларускай этнакультуры з дапамогай сучасных тэхналогій на аснове замежнага сучаснага вопыту не ў поўнай меры раскрыта ў навуковай літаратуры. Беларуская культура, па сутнасці этнамузычнае выхаванне, дзякуючы даўнім традыцыям, мае багаты патэнцыял у сучасным асяроддзі. Звернемся да звестак аб традыцыйным музычным этнавыхаванні.

Вялікая роля ў беларускай традыцыі адводзілася персоне музыкі, непасрэднаму носьбіту традыцыі. У навуковай і публіцыстычнай літаратуры персона музыкі разглядаецца як складаная структурная мадэль, якая фарміруецца з дапамогай сацыяльных і псіхалагічных абставін. Мэтадасягальная прылада музыкі – музычны інструмент.

Менавіта паняцце «н а р о д н ы і н с т р у м е н т » у мастацтвазнаўстве мае мноства падыходаў. Так, напрыклад, у «Музычным энцыклапедычным слоўніку» пад тэрмінам маюцца на ўвазе інструменты, якія распаўсюджаны ў народнай музычнай практыцы [1, с. 371]. У межах апошняга падыходу ўсе народныя музычныя інструменты дадаткова падзяляюцца на «спрадвечныя» і «прыўнесеныя».

У вясковым асяроддзі тэрмін «м у з ы ч н ы і н с т р у м е н т » замацаваны толькі за пэўнымі гукавымі прыладамі (дудой, скрыпкай, гармонікам, цымбаламі і т.д.), але ў этнаінструментазнаўчай навуцы ён распаўсюджваецца на ўсе гукавыя прылады, укаранёныя ў народны побыт.

У працы М.Я. Нікіфароўскага «Очерки Витебской Белоруссии «Дударъ и Музыка» [2] апісваюцца этапы навучання музыкі на пэўным музычным інструменце ў традыцыі. У працэсе аналізу працы можна вулучыць наступныя этапы.

Першапачаткова чалавек знаёміцца з пэўнымі музычнымі традыцыямі яшчэ да нараджэння: цяжарная жанчына спявае песні, слухае музыку. Таксама на этапе нараджэння дзіцяці, у межах радзіннага абраду, гучаць традыцыйныя спевы, часам музыка; на працягу пэўнага часу сталення дзіцяці кожная маці спявае дзецям калыханкі ды забаўлянкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Увесь час свайго дзяцінства чалавек знаходзіўся ў актыўнай стадыі назірання за святамі сям'і. Праз некаторы час дзіця пачынала пераймаць гукі жывёлаў ды птушак праз узаемадзеянне з простымі музычнымі інструментамі (лісткі, травінкі, пер'е, трасцінкі, ніткі і г.д.).

На наступным этапе, пры дапамозе старэйшых, дзеці маглі вырабляць са сцвалістых раслін пішчыкі, свістулькі. Потым іх чакаў выраб пішчыкаў з іграВымі адтулінамі, а падчас вясны – духавых інструментаў з кары дрэваў; тыя, каго зацікавілі струнныя інструменты, маглі нацягваць струны на дошкі, ці пры дапамозе дарослых набыць дзіцячыя скрыпкі, ці адразу прафесійныя.

Прыкладна ў 15 гадоў дзеці рабілі дакладны выбар музычнага інструмента на свой густ. Папулярнасцю карысталіся як скрыпкі, так і жалейкі. Дзеці, што не страцілі зацікаўленасці музычнымі інструментамі, працягваюць граць далей, да сталага узросту.

Практыкуючы музыка бачыў, як граюць іншыя, і імкнуўся палепшыць свой прафесіяналізм (спаборніцкі дух заўседы быў вельмі моцны). На працягу жыцця музыка на слых пераймаў розныя найгрышы, якія чуў ад іншых; пасля засвойвання асноўнай тэмы, імкнуўся дадаць мелодыям асабістыя імправізацыі, так званае, «развіццё голасу» на свой густ. Дзякуючы канкурэнцыі, у вуснай традыцыі існуюць тэрміны «граць па-людску», «добра перабірае», якія характарызуюць крытэрыі грання. Музыкі стараліся выкарыстоўваць усе інавацыі свайго часу, хутка інавацыі ўсталёўваліся і «абрасталі» новымі падрабязнасцямі.

Калі ўзгадаць найлепшыя сучасныя педагагічныя сістэмы, створанныя на аснове традыцый, у першую чаргу трэба назваць агульнапрызнаную сістэму навучання дзяцей музыцы па методыцы Карла Орфа (пры супрацоўніцтве са знаўцам фальклору Куртам Заксам), у якой навучанне складаецца з пэўных частак: маўленчыя практыкаванні, паэтычнае музіцыраванне, музычна-рухавыя практыкаванні, гульні з інструментам, элементарны музычны тэатр.

Заняткі праводзяцца ў інтэрактыўнай форме, развіваюць камунікацыйную функцыю, што спрыяе развіццю псіхічнай актыўнасці і эмацыйнай сферы. Орфаўская сістэма забяспечвае трывалы падмурак для наступнага творчага развіцця асобы дзіцяці, што, безумоўна, спатрэбіцца ў далейшым жыцці.

Сутнасць прынцыпу методыкі Шынічы Сузукі заключана ў падабенстве прыёмаў музычнага навучання з натуральным працэсам успрымання дзіцяці матчынай гаворкі. Асноўная мэта дадзенай сістэмы – акружыць дзіця музычным фонам, зрабіць так, каб гукі музычных твораў для малых дзяцей сталі звыклымі. Найважнейшы момант – навучанне музыцы без прымусу. Першапачаткова сваю методыку Сузукі распрацоўваў для навучання ігры на скрыпцы. У нашы дні сучасныя педагогі-наватары адаптавалі яе для такіх музычных інструментаў, як віяланчэль, альт, флейта, гітара і фартэпіяна.

У школах Сузукі бацькі таксама вучацца: калі няма магчымасці займацца дома, дзіця можна вадзіць у спецыялізаваны цэнтр, які займаецца ранняй адукацыяй. Аднак заняткі бацькі павінны наведваць абавязкова, каб ведаць усе п'есы, песні, практыкаванні, над развучваннем якіх працуе іх дзіця. Многія адукацыйныя ўстановы праводзяць курсы для бацькоў, на якіх вучаць правільна дапамагаць юным талентам выконваць «хатнія» заданні па музыцы.

Нельга не ўзгадаць аднаго з найцікавейшых педагогаў Беларусі І.І. Сучкова. Ім быў распрацаваны праект «Этнашкола» на базе звычайнай Мінскай сярэдняй школы. Дзяцей навучалі традыцыйнай беларускай культуры. Над праектам працаваў цэлы штат спецыялістаў, спецыяльна дзеля «Этнашколы» імі былі распрацаваны аўтарскія праграмы навучаня, якія былі ўзгодненыя і звязаныя адна з адной.

У этнапедагагічным кантэксце на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь вядомы выкладчык Мікола Козенка. Без яго немагчыма ўявіць фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня».

Усе згаданыя раней педагагічныя сістэмы маюць структурнае падабенства з традыцыйнай музычнай адукацыяй, у іх выкарыстоўваюцца зыходныя педагагічныя інструменты.

На дадзеным этапе цэлы шэраг краін, этнасаў паспяхова захоўвае каранёвую культуру ў час развіцця і засілля тэхналогій. Этнавыхаванне тут інтэгруецца непасрэдна ў інавацыі, выкарыстоўваюцца ўсе сучасныя сродкі, з культурных адметнасцей вырастае брэнд. Напрыклад, у Нарвегіі, дзякуючы вялікай папулярнасці серыяла «Вікінгі» (2013 год), пры каледжы дадатковай адукацыі на базе ўніверсітэта «FOLKEHOGSKULE» (за 150 км. ад горада Осла) была адкрыта «школа Вікінгаў» (2015 год), якая таксама карыстаецца папулярнасцю ў замежнікаў. І ў 2015 годзе з'яўлецца адукацыйная праграмма для навучэнцаў (рамёствам Вікінгаў). Гэта сведчыць аб тым, што сінтэз інавацыя + традыцыя (гісторыя) з'яўляецца паспяховым варыянтам.

Сёння ўсе сацыяльныя сферы ў сваім развіцці хутка рухаюцца наперад. Таму этнавыхаванне павінна таксама рухацца побач з гісторыяй і інавацыяй.

**Спіс літаратуры:**


1. Музыкальный энциклопедический словарь / под ред. Г. Келдыш. – М. : Сов. энцикл., 1990. – 672 с.
2. Никифоровский, Н. Очерки Витебской Белоруссии. II. Дударь и Музыка / Н. Никифоровский // Этнографическое обозрение. – М. : Т-во Скоропечатня А. Левенсонъ, 1892. – 35 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ